УДК: 61:615.1(043.2)
ББК: 5:52.82
А 43
ISBN: 978-985-21-0765-5



***Трухановіч Я. Г.***

# РОЛЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў СУЧАСНЫМ МЕДЫЦЫНСКІМ ГРАМАДСТВЕ

***Навуковы кіраўнік: ст. выкл. Носік А. А.***
*Кафедра беларускай і рускай моў*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г. Мінск*

Няцяжка заўважыць, як з году ў год у сучаснай моладзі ўзрастае цікавасць да беларускай мовы. Нягледзячы на свой даволі складаны лёс, у XXI стагоддзі беларуская мова ўсе мацней і мацней умацоўвае свае пазіцыі ў грамадстве. Гэта пацвярджаецца ўзнікненнем шматлікіх беларускамоўных песенных гуртоў, спевакоў, якія аддаюць перавагу выкананню твораў на беларускай мове, перакладам сучаснай літаратуры і кінастужак на беларускую мову, павелічэннем колькасці тэатральных пастаноў па творах беларускіх пісьменнікаў і ўзнікненнем новага пакалення літаратурных дзеячаў, якія дзень за днём уносяць свой уклад у развіццё класічнай прозы і паэзіі, адкрываюць новыя стылістычныя жанры і такім чынам сваёй дзейнасцю спрыяюць адраджэнню беларускага прыгожага пісьменства. Усё гэта стварае нацыянальную беларускамоўную эстэтыку і павышае аўтарытэт берарускай мовы не толькі сярод яе носьбітаў, але і на сусветнай моўнай арэне.

Аднак не ва ўсіх ўсе сферах жыцця грамадства беларуская мова знаходзіцца на аднолькавым узроўні. У прыватнасці, у медыцынскай сферы роля беларускай мовы зведзена да мінімуму.

Мэта дадзенай працы – вызначыць, які ўплыў аказвае беларуская мова на сучасную медыцынскую супольнасць, дзе яна не з’яўляецца асноўным патрабаваннем для выканання прафесійных абавязкаў.

Згодна з апытаннем, якое праводзілася сярод студэнтаў 1 і 2 курсаў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта і Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, больш за 54% рэспандэнтаў ужываюць беларускую мову ў сваім паўсядзённым жыцці; каля 43,2% хацелі б мець магчымасць навучацца на беларускай мове ў абранай навучальнай установе. Высветлена, што 57,5% плануюць выкарыстоўваць беларускую мову ў сваім прафесійным жыцці.

З дапамогай апытання была вылучана праблема недахопу навуковых матэрыялаў медыцынскага зместу, якія маглі б дапамагчы беларускамоўным студэнтам якасна павышаць свой прафесійны лексічны запас і атрымліваць дакладную інфармацыю на абранай імі мове.

Такім чынам, на падставе атрыманых звестак можна зрабіць выснову, што нават у медыцынскім грамадстве беларуская мова адыгрывае дастаткова істотную ролю. З аднаго боку, гэтаму спрыяе папулярызыцыя мовы на дзяржаўным узроўні, а з другога – зацікаўленасць самога грамадства, бо, як казаў Уладзімір Караткевіч: “Хто забыў сваіх продкаў – сябе губляе, хто забыў мову – усё згубіў”.